# Янка Купала

(1882-1942)



## Тэма ўрока

# Асноўныя этапы жыцця і творчасці Янкі Купалы

# МЭТЫ:

- пазнаёміць вучняў з асноўнымі этапамі жыцця і творчасці Янкі Купалы;
- зацікавіць вучняў да чытання твораў пісьменніка;
- выхоўваць любоў да роднай літаратуры, да спадчыны

# Эпіграф:

Стаім мы перад будучыняй нашай
І ўсё варожым, сочым ёйны ход ...
Ці ўскрэснім мы, душой упаўшы,
звяўшы,
Каб выйсці ў свет, як нейкі здольны род...

Я.Купала

# Ваколіцы Вязынкі





# КУПАЛЛЕ



# ВАРАЖБА

І, як даўней, на волю
хвалі
Дзяўчаты кідаюць вянкі...

А. Вольскі






"Цёплым летам на
Купалле
Як ноч ляжа без граніц,
Зводы,чары бліжай,
далей
Відны ў пушчы над
крыніцай
Ля калоды, на калодзе –
У кожным лесавым
куточку,
Кветка-папараць
усходзе,
Зацвітае ў гэту ночку".

"У Купальскую ноч",1911г

# Родныя мясціны



Вязынка.
Хата, дзе паэт нарадзіўся,-
цёплы прытулак памяці

# БАЦЬКІ ПІСЬМЕННІКА



Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч



Бянігна Іванаўна Луцэвіч

# Родная хата паэта

І старая, і малая
хатачка мая...



# Яська ў шасцігадовым узросце



Ужо ў гэтым узросце будучага пісьменніка пачала цікавіць народная спадчына: песні, казкі, святы...

# Успамін

«Прагнасць да ведаў не давала мне спакою, хоць усе дарогі да навукі, як гаворыцца, былі для мяне адрэзаны. Адно, што засталося, — гэта кнігі, і я ім аддаўся ўсёй душой і сэрцам.»

Я. Купала.



# Успамін



« Да 21 года гаспадарыў дома — араў, касіў, сек дровы... Гаспадарка на чужой зямлі апрыкрала. Кінуў гаспадарыць дома і пайшоў шукаць «лёгкага» хлеба. Гэтак праслужыў тры гады ў броварах чорнарабочым. Зазнаў там такога пекла, якога яшчэ дагэтуль не меў.»

Я. Купала. *Аўтабіяграфія*

# Першы надрукаваны верш






Мужык*)

Што я мужык, усе тут знаюць,
І як гавяда гэты свет вялік,
З мяне ўсмяюцца, пагарджаюць,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Чытаць, пісаць я не умею,
Не ходзе гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Бо с працы хлеб свой дабываю,
Бо знаю лаянку і крык,
І свята рэдко калі знаю,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Галодны дзеці век без хлеба,
Падзёрты жончын чаравік,
Не маю грошы, а ні патрэбы,—
Бо я мужык, дурны мужык.

*) Верш гэты быў надрукаваны ў мінскай расейскай газеце „Северо-Западный Край", 15/V 1905 г. № 746. Гэта першы мой выступ у беларускай літаратуры. Аўтар.

# Першы зборнік

“ Першы зборнік маіх вершаў быў двойчы канфіскаваны: першы раз – па распараджэнню Пецярбургскага камітэта па справах друку, а другі раз – па прапанове віленскай адміністрацыі.”

Я. Купала



# “НАША НІВА”




«Якую ролю я адыгрываў у «Наша Ніве»? Даводзілася ўсё рабіць: папраўляць рукапісы, у асаблівасці вершы, перакладаць з польскай, рускай або ўкраінскай моваў, рабіць карэктуру, дапамагаць у экспедыцыі газеты і г. д. Усё гэта даводзілася рабіць таму, што штат работнікаў быў вельмі абмежаваны.»

Я. Купала

*З аўтабіяграфічных матэрыялаў*

# Пецярбургскі перыяд

Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,

Над крыжамі бацькоў, над нягодамі.

Занімай, Беларусь маладая мая,

Свой пачэсны пасад між народамі!..



«Маладая Беларусь.» 1911 — 1912

# 1913 год

Вяршыняй дакастрычніцкай творчасці Я. Купалы з'яўляецца зборнік «Шляхам жыцця»



# ЯВАР І КАЛІНА


Янка Купала і Ул. Ф. Луцэвіч. 1916 .

“Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.”

Я. Купала

# 1916 год
# прызваны ў царскую армію

“Я даўно чакаю таго дня, каб вярнуцца ў Беларусь. Мне хочацца хутчэй уключыцца ў літаратурную работу і пачаць больш пісаць твораў аб новым жыцці нашага народа.” Я.Купала



# 1922 год

У 20-х гадах працягвае змагацца за адраджэнне Беларусі



# Званне народнага паэта



- У 1925 годзе ў сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці Янку Купалу было прысвоена званне народнага паэта Беларусі

# Першы з’езд пісьменнікаў

- У 1934 годзе Янка Купала ўдзельнічае ў рабоце Першага з’езда савецкіх пісьменнікаў, дзе ўпершыню сустракаецца з Максімам Горкім. Тут паэт выступіў з вершам-заклікам «Трэба нам песень»



# Дача Янкі Купалы ў Ляўках



Плённым у жыцці народнага песняра быў “ляўкоўскі перыяд.” Гэта сапраўдная “болдзінская восень” паэта. Лепшыя вершы савецкага часу былі створаны тут.

# Ляўкі

«Жыццё наша такое бадзёрае, вясёлае, што песні самі на вусны просяцца. Далі такія ў нас ясныя і прыгожыя, людзі такія ў нас, што сапраўды кожны з іх можа стаць героем у любы час, у любы міг; справы такія ў нас пайшлі, што ў кожным куточку Саюза Саветаў, у любым калгасе, на любым заводзе можна заваяваць сабе сусветную славу.»

Я. Купала



# 1939 год - ордэн Леніна



« ...Багатай узнагародай адказаў мне народ на мае песні. У многа разоў узнагароджана мая скромная, але ішоўшая заўсёды ад самага сэрца праца.»

Я. Купала

# МАСКВА

1940 ГОД

# Мінск, разбураны фашыстамі



# Кліч да беларускага народа




«Беларусы, браты і сёстры мае! Пачалася вялікая і бязлітасная расплата з подлымі захопнікамі. На нашай зямлі знайшлі сабе магілы звыш шасці мільёнаў гітлераўцаў. Банды гітлераўскіх ваяк ужо коцяцца з савецкіх земляў, усцілаючы дарогі дзесяткамі тысяч трупаў штодзень і паліваючы нашы палі сваёй паганай крывёю...

Блізак час, калі зноў мы збяромся ў шчасці і радасці вялікай сваёй сям'ёй народнай зямлі для вялікай працы аднаўлення і творчасці.»

Я.КУПАЛА

# Гасцініца “Масква”

28 чэрвеня 1942 года Янка Купала памёр.

Дваццаць гадоў яго прах пакоіўся ў Маскве. Да 80-годдзя з дня нараджэння паэта урна з прахам была перавезена ў Мінск.



# Надмагільны помнік





# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ НАРОДНАГА ПАЭТА

# Парк імя Янкі Купалы

# КУПАЛАЎСКІ ПАРК

“Я люблю гэты помнік  просты
Пад  высокім зялёным шатром...
І нібы не было тае
ростані
Пад аркестра журботны гром.
Я гляджу на аблічча
роднае,
Песню славы складаю
з зарой.
Ты заўсёды, пясняр наш,
з народам быў,
І народ будзе вечна з табой.”
П. Панчанка



# КАМПАЗІЦЫЯ “ВЯНОК”



“ І, як даўней, на волю хвалі
Дзяўчаты кідаюць вянкі.
Якія кветкі ў спалучэннях
Любоўна сплеценых
вянкоў!
А мне прыносіць ачышчэння
Струмень купалаўскіх радкоў.”

А. Вольскі “Купалле”

# МУЗЕЙ СЛАВУТАГА ПАЭТА

“Цяпер стаіць тут
светлы дом,
Музей славутага
паэта.»

А. Астрэйка



Літаратурны музей
Янкі Купалы

# ПА ЗАЛАХ МУЗЕЯ





# Літаратурная спадчына

